**Тэма ўрока:** Лік 12

**Мэта:** плануецца, што ў канцы ўрока вучні будуць ведаць прыём утварэння і абазначэння ліку 12, умець выконваць складанне і адніманне на аснове дзесятковага саставу ліку 12.

**Задачы асабістага развіцця:** садзейнічаць фарміраванню пазнавальных уменняў, а таксама стварэнню ўмоў для разумовых навыкаў.

**Абсталяванне:** набор геаметрычных фігур; прадметныя малюнкі, карткі з лічбамі і знакамі; малюнкі-узоры напісання лічб 1 і 2.

**Ход урока**

**I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЭТАП.**

Празвінеў званок вясёлы,
Мы пачаць урок гатовы.
Будзем слухаць, разважаць,
І адзін аднаму дапамагаць.

**II. ПАДРЫХТОЎКА НАВУЧЭНЦАЎ ДА ПРАЦЫ НА АСНОЎНЫМ ЭТАПЕ.**

**Вуснае лічэнне**

1.Размясціце лікі ў ***11, 0, 5, 2, 7, 10, 9, 8, 3*** у парадку ўзрастання і ўбывання.

Назавіце самы меншы лік, самы большы.

Які лік стаіць паміж лікамі 3 і 5, 7 і 9?

Назавіце суседзяў ліку 10.

Які лік знаходзіцца на пятым месцы ў натуральным радзе лікаў?

Як з ліку 10 атрымаць 11?

Колькі дзясяткаў змяшчае лік 11?

2. Гульня "Жывыя лічбы".

Настаўнік выклікае да дошкі 10 вучняў для выканання заданняў і раздае ім лічбы ад 1 да 10. Астатнія вучні класа знаходзяцца за партамі і сочаць за правільнасцю выканання заданняў.

а) Настаўнік называе лікі, а вучань, трымаючы адпаведную лічбу, робіць крок наперад;

б) выходзяць “суседзі” названага ліку;

в) настаўнік называе прыклады, і выходзіць толькі той, у каго знаходзіцца лічба-адказ да дадзенага прыкладу.

3. Прадоўжыце ланцужок вылічэнняў:

а) 


б) 


**Настаўнік.** На колькі лік 10 меншы за лік 11? Які лік абазначае дзясятак? Калі да дзясятка дадаць адну адзінку, які лік атрымаецца?

4. Практычная работа. На партах у вучняў трохвугольнік і па 11 кругоў “кропак” двух колераў. Кожны вучань павінен выкласці кругі “кропкі” на трохвугольнік і расказаць, які варыянт разбіцця ліку 11 у яго сустрэўся. Напрыклад:



1 – гэта 9 і 2.

**Настаўнік.** Складзіце ўсе магчымыя роўнасці для свайго разбіцця, укажыце ў роўнасцях часткі і цэлае. Пакладзіце яшчэ адзін круг “кропку” на свой трохвугольнік, палічыце. Колькі кругоў атрымалася?

Тэма нашага ўрока – “Лік 12”. Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з утварэннем ліку 12, будзем вучыцца выконваць складанне і адніманне на аснове дзесятковага саставу ліку 12.

## III. ЭТАП ЗАСВАЕННЯ НОВЫХ ВЕДАЎ І СПОСАБАЎ ДЗЕЯННЯЎ.

Настаўнік прапануе разгарнуць вучэбны дапаможнік [3, с. 8] і рагледзець малюнкі ў рамцы, задае пытанні аб тым, колькі палачак было, колькі дабавілі, колькі стала, просіць разгледзець лічбу 12, звяртае ўвагу на ўзоры друкаванай і пісьмовай лічбы.

**Настаўнік.** Колькі неабходна дадаць да дзясятка, каб атрымаць лік 12? Які лік атрымаецца, калі да 11 дадаць 1? Колькі атрымаецца, калі ад 12 адняць 1? 10?

Назавіце дзесятковы састаў ліку 12?

Вучні, арыентуючыся на лікавы прамень, рашаюць прыклады на картачках [2, с. 8].




10 + 2 = □□ 12 – 2 = □□

2 + 10 = □□ 12 -10 = □□

Настаўнік прапануе рашыць прыклады № 1 [3, с. 8] і параўнаць лікі і лікавыя выразы ў заданні № 2 [3, с. 8]. (Работа праводзіцца каля дошкі і на месцах.)

Вучні разам з настаўнікам знаёмяцца з умовамі задач № 3 і № 4 [3, с. 8]. Прыклады, якія з’яўляюцца рашэннем і адказам да задач, яны выкладваюць на партах з дапамогай картак з лічбамі і знакамі дзеянняў.

*Дзеці выконваюць рухі, якія нагадваюць дзеянні, апісаныя ў фізкультхвілінцы.* [1].

**Фізкультхвілінка**

Дзве сяброўкі – дзве рукі
Весела працуюць:
Вяжуць, шыюць, ткуць, прадуць,
Мыюць і прасуюць.

Дзве сястрыцы – дзве рукі
Гарады будуюць,
Водзяць у рэйсы цягнікі,
Граюць і друкуюць.

Беляць столь,
Мятуць падлогу,
Асфальтуюць нам дарогу...

Умеюць дошку габляваць,
Чыста бульбу абабраць,
Расчасаць галоўку,
Зашпіліцца лоўка,
І ляпіць, і маляваць,
І ў сшытку літары пісаць.

**Настаўнік.** А што любяць рабіць вашы ручкі? А хто з вас дапамагаў сваім бацькам гатаваць ежу. Раскажыце, як гэта адбывалася?

Пасля настаўнік прапануе вучням аб’яднацца ў групы і вырашыць, што было спачатку, а што было потым у заданні № 6 [3, с. 9]. Затым яны расшыфроўваюць словы з задання № 5 [3, с. 9].

**Настаўнік.** Колькі адзінак змяшчае дзясятак? Назавіце лікі меншыя за дзясятак. Колькі адзінак трэба дадаць да дзясятка, каб атрымаць 12?

*Фізкультхвілінка для вачэй*

## IV. ЭТАП ПРЫМЯНЕННЯ ВЕДАЎ І СПОСАБАЎ ДЗЕЯННЯЎ.

**Настаўнік.** Параўнайце лікі і лікавыя выразы. Запішыце ў сшыткі правільныя роўнасці і няроўнасці [4, с. 5].

Пасля выканананння задання ажыццяўляецца праверка, ацэньваюцца работы па крытэрыі “правільнасць/няправільнасць”.

Вучні дэманструюць “напісанне” лічб 1 і 2 у паветры, у сшытках пішуць лікі 11 і 12 [4, с. 5]. Затым арганізуецца ўзаемаацэнка ў парах па крытэрыі “акуратнасць/неахайнасць”.

**Настаўнік.** Колькі арэхаў было ў вавёркі? Што значыць “столькі ж”? Колькі арэхаў стала ў вавёркі? Якая схема адпавядае ўмове задачы? Які лікавы выраз з’яўляецца рашэннем задачы?

Вучні абводзяць правільную схему і лікавы выраз, які з’яўляецца рашэннем задачы № 3 і запісваюць адказ [4, с. 5]. Пасля выканананння задання ажыццяўляецца праверка, ацэньваюцца работы па крытэрыі “правільнасць/няправільнасць”.

## V. ЭТАП ЗАМАЦАВАННЯ НОВЫХ ВЕДАЎ І СПОСАБАЎ ДЗЕЙНАСЦІ.

У дзвюх курыц, дзвюх суседак,
Выйшла сварка за сваіх дзетак:
На лужку раніцай гэтай
Пераблыталіся ўсе дзеці.
Мамы-курыцы усё плачуць,
Дзетак лічаць і іх клічуць,
А кураняты ўсё гуляюць,
Чарвякоў у зямлі капаюць.

Спынілі мамы спрэчку:
Мала ж толку нам ад сварак!
Памірыліся не дарам:
Разабраліся тут мамы,
Што яны былі не правы.
Нумаркі ў іх на шыі –
Не для прыгажосці іх задума!
А зараз паспрабуйце самі
Разгадаць сакрэтэ гэтых мам!




## VI. ЭТАП ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ УРОКА.

**Настаўнік.** Успомніце мэты, якія ставілі?
Наколькі паспяховым быў кожны ў дасягненні мэт, пакажа заданне "?" [3, с. 9].
З якім лікам вы пазнаёміліся на ўроку?
Як з ліку 10 атрымаць лік 11? Лік 12?
Колькі трэба дадаць адзінак да ліку 11, каб атрымаць 12?
Колькі прадметаў абазначае лік 12?
На якім месцы ў натуралным радзе лікаў знаходзіцца 12?
Які лік меншы 12 ці 10? На колькі?
Які лік большы 10 ці 12? На колькі?

**Рэфлексія**

У заканчэнні ўрока прапаную вам высветліць , наколькі засвоена тэма:

- устаньце тыя, у каго у працэсу ўрока цяжкасцей не ўзнікла;
- падніміце руку, калі засталіся пытанні;
- падніміце дзве рукі, калі працаваць было цяжка.

Дзякуй за ўрок!

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Беларуская мова. Фізхвілінкі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://belaruskaja.blogspot.com/p/blog-page_1.html. – Дата доступу : 24.03.2022.
2. **Займальная матэматыка.** займалачка: частка-2; /Е.М.Рудая. – Мозыр: Палескае слова, 2020. – 48 с. : іл.
3. **Матэматыка:** вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. 2 частка. //Г.Л.Мураўёва., М.А.Урбан. – Мінск: НІА, 2019.
4. **Матэматыка:** рабочы сшытак: вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. 2 частка. //Г.Л.Мураўёва., М.А.Урбан., С.В.Гадзаава., С.А.Капылова. – Мінск: НІА, 2019.